С.В. Мянькова,
начальнік аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння
павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Маніторынг адукацыйных запатрабаванняў работнікаў сферы культуры як фактар фарміравання кантынгенту слухачоў

У сістэме ДАД сферы культуры на сённяшні дзень найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў на ўзроўнях вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

Штогод больш за 3000 работнікаў устаноў сферы культуры і мастацтва праходзяць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў. Так, у 2014 г. змест адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры засвоілі 3385 чалавек, у 2015 г. — 3285. Пры гэтым Інбелкульт забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі прыкладна на 40—50 % спецыялістаў галіны, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі — на 25—30 % [2; 3].

Інбелкульт выконвае дзяржаўны заказ на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў галіны за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

У Інбелкульце штогод распрацоўваецца План павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры (далей — План), які зацвярджаецца Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь.

План змяшчае раздзелы:

1. Павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галіны культуры: назва праграмы; катэгорыя слухачоў; форма, працягласць навучання (у мес.); тэрмін правядзення курсаў; колькасць слухачоў; фарміраванне кантынгенту слухачоў па абласцях, г. Мінск, установах рэспубліканскага падпарадкавання.

2. Перападрыхтоўка кіруючых работнікаў і спецыялістаў галіны культуры: назва спецыяльнасці; агульны тэрмін (у годзе), этапы, форма навучання; тэрмін навучання агульны (у годзе); колькасць слухачоў; фарміраванне кантынгенту слухачоў па абласцях, г. Мінск, установах рэспубліканскага падпарадкавання.

Пры распрацоўцы Плана колькасць слухачоў кожнай вучэбнай групы павінна фарміравацца з улікам патрабавання арт. 250 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі аб напаўняльнасці вучэбных груп павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, якія навучаюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў (25—30 чалавек) [1]. Неабходнай умовай эфектыўнага планавання так-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сама з'яўляецца хуткае рэагаванне ўстановы адукацыі на пастаянна ўзрастаючыя патрабаванні спажыўца да якасці адукацыйных паслуг, зместу і варыятыўнасці адукацыйных праграм.

Паспяховай канкурэнцыі Інбелкульта на рынку адукацыйных паслуг, задавальненню адукацыйных запатрабаванняў слухачоў садзейнічае вывучэнне попыту патэнцыяльных спажыўцоў названых паслуг.

План у Інбелкульце рыхтуецца на падставе даных маніторынгу адукацыйных запатрабаванняў работнікаў галіны па распрацаваных формах (форма 1, форма 2), якія рассылаюцца для запаўнення ва ўстановы культуры абласцей і г. Мінск:

*Форма 1*

**Пералік і колькасць работнікаў устаноў сферы культуры і мастацтва_______ вобласці (г. Мінск), устаноў рэспубліканскага падпарадкавання, якія маюць патрэбу ў павышэнні кваліфікацыі ў ____ годзе (па катэгорыях)**

| Катэгорыя работніка | Колькасць слухачоў | Найбольш запатрабаваная тэматыка адукацыйных праграм |
|---|---|---|
| | | |
| | | |

*Форма 2*

**Спіс работнікаў устаноў сферы культуры і мастацтва ________ вобласці (г. Мінск), устаноў рэспубліканскага падпарадкавання, якія маюць патрэбу ў перападрыхтоўцы ў _____ годзе (па спецыяльнасцях)**

| Прозвішча, імя супрацоўніка, які накіроўваецца на перападрыхтоўку | Месца працы, пасада | Інфармацыя аб асноўнай адукацыі |
|---|---|---|
| **Перападрыхтоўка на ўзроўні вышэйшай адукацыі (тэрмін навучання 22—24 мес.)** | | |
| **Перападрыхтоўка на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі (тэрмін навучання 9 мес.)** | | |
| | | |
| | | |

Дадзеныя формы накіроўваюцца Інбелкультам у галоўныя ўпраўленні ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, райвыканкамаў кожнай вобласці, а таксама ва ўстановы рэспубліканскага падпарадкавання. Звесткі аб адукацыйных запатрабаваннях работнікаў устаноў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры і мастацтва збіраюцца па рэспубліцы на працягу месяца і падаюцца ў Інбелкульт для сістэматызацыі, аналізу, падрыхтоўкі зводу ў электронным выглядзе.

Звод даных аб адукацыйных запатрабаваннях работнікаў сферы культуры дазваляе сфарміраваць пералік адукацыйных праграм і кантынгенту работнікаў сферы культуры, колькасць работнікаў, якія маюць патрэбнасць у павышэнні кваліфікацыі (па катэгорыях) і перападрыхтоўцы (па спецыяльнасцях) на чарговы каляндарны год.

Так, у адпаведнасці з данымі маніторынгу, праведзенага ў 2014 г., патрэбнасць у адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі, якія рэалізуюцца ў Інбелкульце, на 2015 г. склала (па катэгорыях):

работнікі кіруючых органаў культуры — 93 чалавекі;
работнікі клубных устаноў — 408 чалавек;
работнікі бібліятэк — 416 чалавек;
работнікі музеяў — 156 чалавек;
работнікі ўстаноў адукацыі сферы культуры — 1197 чалавек;
работнікі арганізацый кінавідэапракату — 21 чалавек.

Агульная колькасць работнікаў устаноў культуры і мастацтва, якія маюць патрэбнасць у адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі, што рэалізуюцца ў Інбелкульце, на 2015 г. склала 2291 чалавек, у тым ліку 409 чалавек — кіраўнікі ўстаноў сферы культуры, 1882 — спецыялісты.

У адпаведнасці з данымі маніторынгу, праведзенага ў 2015 г., патрэбнасць у адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі, якія рэалізуюцца ў Інбелкульце, на 2016 г. склала (па катэгорыях):

работнікі кіруючых органаў культуры — 42 чалавекі;
работнікі клубных устаноў — 431 чалавек;
работнікі бібліятэк — 267 чалавек;
работнікі музеяў — 94 чалавекі;
работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры — 1437 чалавек;
работнікі тэатральна-відовішчных арганізацый — 31 чалавек;
работнікі арганізацый кінавідэапракату — 98 чалавек.

Агульная колькасць работнікаў устаноў культуры, якія маюць патрэбнасць у адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі, што рэалізуюцца ў Інбелкульце, на 2016 г. склала 2400 чалавек, у тым ліку 539 чалавек — кіраўнікі ўстаноў сферы культуры, 1861 — спецыялісты.

Даныя маніторынгаў, праведзеных у 2014 і 2015 гг., з’явіліся базай фарміравання кантынгенту слухачоў для Плана на 2015 г. і Плана на 2016 г.

З улікам узросшага попыту на адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і дзіцячых школ мастацтваў у План на 2016 г. уключаны:

7 груп павышэння кваліфікацыі настаўнікаў па класу фартэпіяна дзіцячых школ мастацтваў (3 групы — настаўнікі з г. Мінск);



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4 групы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў па класу баяна, акардэона дзіцячых школ мастацтваў (1 група — настаўнікі з г. Мінск);

3 групы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў па класу струнных народных інструментаў (гітары, балалайкі, домры, мандаліны) дзіцячых школ мастацтваў (1 група — настаўнікі з г. Мінск) і г.д.

Фарміраванне іншага кантынгенту слухачоў павышэння кваліфікацыі (работнікі кіруючых органаў культуры, клубных устаноў, бібліятэк, музеяў, тэатральна-відовішчных арганізацый, арганізацый кінавідэапракату і інш.) таксама ажыццяўляецца зыходзячы з даных маніторынгу. Згодна з запытам у План на 2016 г. уключаны 7 груп павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў г. Мінск — 190 педагагічных работнікаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю ў сферы культуры. Агульная колькасць педагагічных работнікаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і дзіцячых школ мастацтваў г. Мінск, якія павысяць кваліфікацыю ў 2016 г., складзе 295 чалавек.

Дадзены падыход дазваляе забяспечыць павышэнне кваліфікацыі тых катэгорый работнікаў сферы культуры, якія адчуваюць патрэбнасць у атрыманні новых ведаў, а таксама выкананне патрабаванняў заканадаўства аб напаўняльнасці груп павышэння кваліфікацыі.

Акрамя таго, маніторынг адукацыйных запатрабаванняў работнікаў устаноў культуры спрыяе ўдасканальванню зместу адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, уключэнню ў праграмы інавацыйных тэхналогій, якія паляпшаюць якасць адукацыйнага працэсу, узмацняюць яго практычную накіраванасць і значнасць.

Так, з улікам пажаданняў работнікаў устаноў культуры і мастацтва былі распрацаваны новыя адукацыйныя праграмы (2015—2016 гг.):

«Сацыякультурная дзейнасць у кантэксце маладзёжнай палітыкі» — для спецыялістаў і метадыстаў упраўленняў, аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі;

«Інавацыйная дзейнасць сучаснай бібліятэкі» — для загадчыкаў аддзелаў (сектараў) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;

«Арганізацыя культурна-адпачынкавай дзейнасці рознаўзроставых катэгорый насельніцтва: сучасныя тэндэнцыі, методыкі і практыкі» — для мастацкіх кіраўнікоў клубных устаноў;

«Рэсурсы дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь» — для бібліятэкараў публічных цэнтраў прававой інфармацыі на базе публічных бібліятэк;

«Функцыянаванне кінапракатных арганізацый у сучасных умовах» — для кіраўнікоў і метадыстаў кінапракатных арганізацый;

«Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў дзейнасці музеяў» — для навуковых супрацоўнікаў навукова-экспазіцыйных і культурна-адукацыйных аддзелаў музеяў;

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

«Інавацыйная дзейнасць сучаснай бібліятэкі» — для бібліятэкараў, бібліёграфаў публічных бібліятэк і г.д.

Маніторынг патрэбы адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія рэалізуюцца ў Інбелкульце, пачаты ў 2015 г.

У адпаведнасці з данымі маніторынгу попыт на перападрыхтоўку ў Інбелкульце на 2016 г. склаў па спецыяльнасцях 1-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», 1-23 02 73 «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці», 2-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» 2-23 02 72 «Культурна-дасугавая дзейнасць» ад 25 да 34 чалавек.

Даныя маніторынгу сведчаць, што запатрабаванай спецыяльнасцю на бюджэтнай аснове атрымання адукацыі застаецца «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (на базе як вышэйшай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі).

Маніторынг адукацыйных запатрабаванняў работнікаў сферы культуры спрыяе эфектыўнаму планаванню кантынгенту адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, удасканаленню зместу адукацыйных праграм і, як вынік, задавальненню пазнавальных патрэбнасцей спажыўцоў адукацыйных паслуг. Практыка правядзення маніторынгу дазваляе аператыўна задавальняць запыт работнікаў сферы культуры ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы, спрыяе сістэмнаму падыходу пры планаванні размеркавання кантынгенту, а таксама кантролю выканання планавых паказчыкаў на працягу года.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2011. — 400 с.
2. *Мянькова, С.В.* Дадатковая адукацыя дарослых у сферы культуры / С.В. Мянькова // Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2013 / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. ДУА «Інстытут культуры Беларусі» ; укл. К.І. Рэмішэўскі, А.А. Галкін ; рэдкал.: Б.У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2014. — С. 119—123.
3. *Мянькова, С.В.* Адукацыя ў сферы культуры / А.А. Мукалаў, С.В. Мянькова, В.Ю. Ігнаценка // Беларуская культура — 2014 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. ДУА «Інстытут культуры Беларусі» ; укл. А.Р. Гуляева, І.Б. Лапцёнак ; рэдкал.: Б.У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2015. — С. 208—219.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ